# “Што такое адзінства”

Кузняцова Аліна Валер’еўна
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа в. Новыя Лышчыцы”
Брэсцкага раёна
Брэсцкай вобласці

Першыя дні восені ў гэтым годзе былі спякотныя, таму вучыцца было цяжкавата. Праз два тыдні крышачку пахаладала, і стала намнога лягчэй працаваць на ўроках. А сёння церусіць дожджык. Ведаю, што калі на вуліцы дождж, то многім хочацца спаць (так у маіх бацькоў), а мне ў такое надвор’е добра думаецца.

Сёння на класнай гадзіне паднялі пытанне пра адзінства. Гаварылі многа, нават невялікі дыспут атрымаўся. Я мала ўдзельнічала ў дыспуце, затое многа думала. Ішла па дарозе дахаты адна, і мне добра было, нават у думках спрачалася сама з сабой. Зараз п’ю каву, а думкі ўсё больш і больш авалодваюць мною.

Лічу, што мне ў жыцці моцна пашанцавала. Я нарадзілася ў прыгожай краіне. Прыемна, што гэта ідзе ад сэрца, бо сваю Беларусь я моцна люблю. Разумею, што гэтую казачную зямлю пад белымі крыламі з блакітнымі рэкамі і азёрамі, з багатымі зялёнымі пушчамі, лясамі, балотамі даў мне сам жывы Бог. Яшчэ ў XVI стагоддзі наш першадрукар і асветнік Францыск Скарына ў прадмовах пісаў, каб мы, беларусы, любілі сваю краіну, бо яна нам Богам дадзена. А любілі, гэта значыць, клапаціліся пра яе, узбагачалі. Радзіма, Айчына, Бацькаўшчына, родны кут, родная зямля, – для мяне ты самая пяшчотная.

Усе мы жывем сем’ямі. Бацькі шчаслівыя, калі разумеюць адзін аднаго, любяць і кахаюць. Я вельмі люблю глядзець, калі мой бацька бярэ маму за руку і гаворыць ёй цёплыя, шчырыя словы, а мама ў адказ па-добраму ўсміхаецца. Бацькі разам вечарамі дапамагаюць адзін аднаму па доме, глядзяць тэлевізар, катаюцца на веласіпедзе. А як хораша на душы, калі бацькі і дзядулі з бабулямі разам сустракаюцца на святы або дапамагаюць у рабоце на агародзе. Лічу, што нашай сям’і пашанцавала з суседзямі. Адзін сусед – аднакласнік, другі – сябар з дзяцінства, стрыечны брат. Адносіны паміж суседзямі – прыклад для мяне,бо яны радасць памнажаюць, а бяду дзеляць. Мае бацькі і суседзі не толькі працавітыя,старанныя, клапатлівыя, але і добрыя, мілыя, сардэчныя. Я бачу, як яны многа робяць на карысць не толькі сваім сем’ям, але і нашай вёсцы. Адзінства паміж імі перадаецца і мне. І я стараюся рабіць нашу вёску Новыя Лышчыцы больш прыгожай і ўтульнай, чыстай і акуратнай.

Я вучуся ў сучаснай школе. У школе працуюць добрыя і разумныя настаўнікі, якія вучаць любіць, прабачаць, дапамагаць, не судзіць нікога, радавацца чужым поспехам, заўсёды – і на дабро, і на зло – адказваць толькі дабром. У школе праводзяць не толькі ўрокі, але і класныя гадзіны, гурткі, конкурсы, вечарыны.Радасна і прыемна, што ўсюды нас вучаць адзінству.

Мне часта цікава параўноўваць і аналізаваць. Бяру канкрэтна наш клас. Клас наш невялікі, усяго трынаццаць вучняў. Мы такія розныя! Такія

эмацыянальныя, актыўныя, шумныя і – добрыя! Кожны са сваім “Я”, са сваім гонарам, са сваімі думкамі і поглядамі. Праўду кажучы, у нас, такіх добрых, бывае не вельмі добра. Мы разумеем, што спрэчкі, сваркі, агіды да дабра ніколі нікога не прыводзілі, таму прабачаем і вучымся ісці далей па дарозе жыцця з павагай да людзей.

Добра, калі ў класе адзінства ў поглядах, ва ўчынках і паводзінах! Лічу, што абсалютнай свабоды не павінна быць, мы ўсе павінны падтрымлівацца нейкіх законаў. А гэтыя законы трэба, каб вялі да парадку, да дысцыпліны. Мы павінны рабіць усё на карысць нашай краіны, бо мы – будучае нашае краіны.

І хочацца, каб яшчэ са школы ўсе засвоілі ўрок, што народ тады моцны, тады яго нельга перамагчы, калі ён адзіны.

Я толькі вучаніца, жыцця (як кажа бабуля) яшчэ не бачыла. Але ўжо разумею, што вельмі добра, калі павага і любоў у сям’і паміж мужам і жонкай, паміж бацькамі і дзецьмі, паміж братам і сястрой, вучнямі і настаўнікамі, суседзямі і аднавяскоўцамі.

Хочацца, каб паміж усімі людзьмі маёй дарагой Беларусі было разуменне і адзінства.